На ўроку, на якім прымяняецца “мазгавы штурм”, адбываецца развіццё навыкаў вырашэння праблемы, а таксама актывізуюцца розныя віды маўленчай дзейнасці. Такім чынам навучэнцы развіваюць навыкі чытання, слухання, а галоўнае – гаварэнне і маўленне. Важным пры гэтым з’яўляецца той факт, што навучэнцы ў працэсе выкарыстання названага метаду мусяць увесь час гаварыць і каментаваць свае меркаванне на роднай мове. Гэта, на наш погляд, спрыяе павелічэнню месца беларускай мовы ў культурна-інфармацыйнай прасторы.

Акрамя таго, абмен уласнымі ідэямі і наступнае іх абмеркаванне спрыяе выпрацоўцы культуры размовы, тактоўнасці, уважлівых адносін да суразмоўцы, а таксама ўменне працаваць у калектыве па пошуку вырашэння праблемы.

Цікавай інтэрактыўнай формай навучання беларускай мове становяцца ролевыя гульні. Простым, трапным і надзвычай эфектыўным спосабам прымянення ролевых гульняў з’яўляюцца інсцэніроўкі, калі навучэнцы ў падрыхтаваных загадзя пад кіраўніцтвам выкладчыка невялічкіх выявах выступаюць у розных вобразах (настаўнікаў, экскурсаводаў, беларускіх асветнікаў): напрыклад, імправізаваная экскурсія па свеце і гісторыі беларускіх літар або мультымедыя-экскурсія ў Полацк часоў Францыска Скарыны.

Ролевыя гульні могуць быць і з удзелам значных груп, нават усяго класа. Гэты спосаб мусіць забяспечыць большае ўцягненне навучэнцаў у вучэбны працэс. Аднак ролевыя гульні для ўсяго класа патрабуюць вялікай папярэдняй падрыхтоўкі. Напярэдадні выкладчык павінен пазнаёміць навучэнцаў з тэмай, апісаннем і асноўнымі палажэннямі гульні, пасля чаго вызначаюцца ролі і праводзіцца індывідуальны інструктаж.

Цікавай ролевай гульнёй у працэсе навучання беларускай мовы выступае “*Арфаграфічная эстафета*” [2, с. 23], дзе навучэнцы выступаюць у ролях “пісьменніка”, “карэктара”, “кур’ера”.

Праведзенае даследаванне тэхналогіі і асаблівасцей выкарыстання інтэрактыўных формаў навучання на ўроках беларускай мовы у сярэдняй школе дазволіла прыйсці да высновы, што правільнае прымяненне разнастайных формаў інтэрактыўнага навучання станоўча ўплывае на вывучэнне мовы і аказвае вялікую дапамогу педагогам у выкладанні іх прадмета. Дадзеныя педагагічныя тэхналогіі павышаюць матывацыю вучняў, выклікаюць у іх цікавасць да прадмета, які вывучаецца, а таксама робяць авалоданне мовай больш эфектыўнай і хуткай.

**Літаратура**

1 Витченко, О. В. Интерактивность как одно из основных требований к современным электронным образовательным ресурсам [Электронный ресурс] / О. В. Витченко // Международный журнал экспериментального образования. – Режим доступа: https://expeducation.ru/ru/article/view?id=4709. – Дата доступа: 24.04.2024.

2 Жуковіч, М. В. Актыўныя адукацыйныя тэхналогіі па фарміраванні свабоднай асобы вучня на ўроках беларускай мовы, літаратуры і пазакласных мерапрыемствах / М. В. Жуковіч. – Мінск : Аверсэв, 2012. – 93 с.

**УДК 373.5.091.3:821.161.3-1*П.Трус**

***Г. А. Іванюк***

## ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ ПАЎЛЮКА ТРУСА Ў ШКОЛЕ

*Артыкул, прысвечаны вывучэнню творчасці Паўлюка Труса ў сярэдняй школе, адлюстроўвае ключавыя моманты ўрока, якія настаўнік можа выкарыстоўваць пры выкладанні тэмы ў 6 класе. Аўтар прыходзіць да высновы пра неабходнасць данясення*

*біяграфічных звестак пра паэта і напаўнення ўрока прыёмамі і формамі актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці вучняў, паколькі зварот да яго творчасці школьнай праграмай прадугледжаны толькі адзін раз, і гэтае знаёмства павінна стаць запамінальным.*

Знаёмства з творчасцю П. Труса прадугледжана школьнай праграмай па літаратуры толькі адзін раз – у 6 класе ў раздзеле "Мастацкае слова: вобразнасць, выразнасць, хараство". Тэма ўрока: "Паўлюк Трус. «Падаюць сняжынкі…» (урывак з паэмы "Дзясяты падмурак"). Хараство зімовага пейзажу. Выяўленне аўтарскіх пачуццяў у творы. Мілагучнасць мовы. Яркасць выяўленчых сродкаў (метафар, эпітэтаў)" [1].

Паколькі школьнікі больш да жыццятворчасці пісьменніка не звернуцца, то адным з варыянтаў работы *на ўступным этапе* можа стаць біяграфічная даведка, спалучаная з дэманстрацыяй партрэта пісьменніка, ці нават лекцыя. Настаўнік павінен паведаміць, што Паўлюк Трус (Павел Адамавіч Трус, 1904–1929) нарадзіўся ў вёсцы Нізок на Уздзеншчыне ў сялянскай сям'і. Прырода вакол вабіла сваёй маляўнічасцю і прыгажосцю. Пазней Паўлюк Трус згадваў: "У дзесяць гадоў я ўжо хадзіў за бараною. Бацька сеяў, а я па свежых слядах баранаваў, і не толькі баранаваў, а нават пад'язджаў на баране, за што ад бацькі часта перападала. У дванаццаць – браў першыя ўрокі на аратага, праца куды менш цікавая, бо патрабавала пільнасці і вялікай увагі. У пятнаццаць гадоў я моцна трымаў касу ў руках і, як спрактыкаваны мастак, добра вымалёўваў шырокія пракосы на нашых прынёманскіх лугах" [2, с. 80]. Яшчэ ў дзяцінстве Паўлюк быў living рознабаковай асобай, цудоўна маляваў, спяваў у хоры, ведаў на памяць мноства народных песень. Свой першы верш таксама напісаў яшчэ ў школьныя гады. Усё сваё нядоўгае жыццё Паўлюк Трус прысвяціў роднай краіне і нацыянальнай культуры, імкнуўся, па яго ж словах, "абудзіць любасць да Беларусі" [2, с. 80]. Яго лірыка вельмі меладычная і эмацыйная.

На ўроку вывучэння творчасці П. Труса, згодна з праграмай, таксама вывучаецца паняцце метафары, што можна зрабіць з дапамогай тэарэтычнай даведкі, змест якой наступны. У штодзённым жыцці мы нярэдка ўжываем фразы ў пераносным значэнні: дождж ідзе, хвіліны бягуць, каліна гарыць. Прамое значэнне такіх слоў праступае ў выразах "*тата ідзе*", "*сабака бяжыць*", "*касцёр гарыць*". Пераноснае значэнне так і названа таму, што мы пераносім дзеянні ці якасці з адной з'явы на другую, падобную да яе. Метафара – перанясенне ўласцівасцей нейкай з'явы на іншую, якой-небудзь прыкметай падобную да яе. Метафары ў многім падобныя да параўнанняў, толькі ў апошнім бачныя дзве часткі, а ў метафары параўнанне прыхаванае: хвіліны бягуць (*рухаюцца хутка, як спартсмен*), каліна гарыць (*колер яе як агонь*). Далей дзеці могуць самастойна азнаёміцца з азначэннем метафары ў падручніку і запісаць асноўныя тэзісы ў сшытак.

Прыклады практыкаванняў *на арыенціровачным этапе* могуць быць наступныя:

1 Рэпрадукыўная гутарка. Настаўнік прапануе дзецям адказаць на пытанні:

– Якія вобразы і малюнкі ўзніклі ў вашым уяўленні пры слуханні верша П. Труса "Падаюць сняжынкі"?

– У якую пару года адбываецца дзеянне, апісанае ў вершы?

– Які настрой абудзіў у вас праслуханы твор: вясёлы, бадзёры ці сумны, маркотны? Чым гэта абумоўлена?

– Колькі сыноў у зімы? Як іх завуць?

2 Праблемная сітуацыя. Прачытайце запісаныя на дошцы радкі верша В. Жуковіча:

*У снежні сняжынкі*
*Занеслі сцяжынкі…*

– Якія зычныя паўтараюцца і што надае гэты паўтор твору? (музычнасць, меладычнасць, стварае вобразнае бачанне снегу, сняжынак, сцяжынак)

– Як называецца такі мастацкі прыём, пры якім паўтараюцца зычныя?

– Як паводзяць сябе сняжынкі ў пейзажнай замалёўцы П. Труса? Успомніце гэтае слова і падумайце, чаму аўтар ужывае яго двойчы?

На *этапе аналізу* можна прапанаваць наступныя прыёмы і формы работы:

1 Заданні на развіццё маўлення, стылёвы шлях аналізу.

– Падбярыце словы-сінонімы да дзеяслова “падаюць” (сцелюцца, сыплюцца, круцяцца, лётаюць і інш.).

– Ці ўявілі вы сабе бялюткія сняжынкі? Паспрабуйце аздобіць іх маляўнічымі эпітэтамі (пушыстыя, мяккія, чыстыя, празрыстыя і інш.), параўнаннямі, метафарамі. Перадайце свае ўражанні ад апісанай у вершы прыгажосці прыроды.

– Пракаменціруйце сэнс наступных аўтарскіх выразаў: “*дацвілі пялёсткі нечае тугі…*”, “*ахінае вечар тонкія мярэжы, на акне альвасы дагаралі ў сне…*”. Які настрой паэта яны перадаюць? А які настрой абуджаюць у вас? Вызначце троп.

– Працягніце думку: мастацкі троп, пры дапамозе якога ўласцівасці адной з’явы пераносяцца на другую, чым-небудзь падобную на яе, называецца … (Метафарай). Знайдзіце гэты мастацкі троп у вершы П. Труса, праанлізуйце яго ролю.

2 Эўрыстычная гутарка, спалучаная з выбарачным чытаннем, з мэтай падрыхтоўкі да выразнага чытання.

– Якое агульнае ўражанне ў вас засталося ад верша П. Труса “Падаюць сняжынкі”?

– Ці толькі смутак гучыць у радках твора П. Труса? А можа, гэта адчуванне спакою, сцішанасці, што наступілі ў прыродзе і ў настроі паэта? Цішыня і спакой агортваюць яго душу, але сум яго па-чалавечы светлы, шчымлівы, з глыбокім адчуваннем філасофіі жыцця і прыроды. Выкажыце свае меркаванні, свае ўражанні.

– Як мяняецца танальнасць твора ў яго апошняй страфе? Прачытайце яе ў адпаведнасці са зменай аўтарскага настрою і ягоных пачуццяў.

3 Заданні на развіццё маўлення з мэтай падрыхтоўкі да вуснага ці пісьмовага выказвання.

– Якія паэтычныя вобразы верша падаліся вам самымі значнымі і прыкметнымі? Вызначце іх ролю ў стварэнні агульнага фону пейзажнага малюнка? (Яны дапамагаюць лепш уявіць абставіны, у якіх разгортваецца дзеянне; даносяць да нас глыбіню пачуццяў аўтара; перадаюць захапленне на першы погляд някідкім хараством пейзажнага малюнка). Адказ свой аформіце ў выглядзе звязнага выказвання.

– Славеснае маляванне. Што вы ўбачылі, уявілі ў гэтай зімовай пары года? Што зразумелі, пачулі?

– Паназірайце за асаблівасцямі надвор’я ў зімовы вечар. Чым вы ўзбагацілі сябе ў час назіранняў? Што спадабалася і запомнілася?

– Рэшэнне крыжаванкі з мэтай замацавання матэрыялу і падрыхтоўкі вучняў да завучвання верша на памяць.

**Па гарызанталі:**

1. Адхінае вечар тонкія ________
3. Дацвілі пялёсткі нечае ______
5. І ўранілі долу снегавы ______

**Па вертыкалі:**

2. І з вачэй ________ сыплюцца на снег
4. Расчасалі _______ шоўкавыя косы
6. Падаюць ________ за маім акном



5 Культуралагічнае параўнанне, спалучанае з дэманстрацыяй, з мэтай абагульнення.

– Ці ведаеце вы, з якімі відамі мастацтва цесна звязана літаратура? *(музыка, мастацтва, тэатр).* Вы ведаеце спектаклі, у якіх ёсць тэма зімы? (“*Шчаўкунчык*”).

– Настаўнік дэманструе відэаўрывак са спектакля “Шчаўкунчык”, а менавіта танец сняжынак. Якія вашы ўражанні пасля прагляду відэа і пасля верша? Ці адрозіваюцца яны? А настрой у іх?

– А ці ведаеце вы якія-небудзь музычныя творы, прысвечаныя зіме? Зараз я ўключу вам запіс мелодыі Антоніа Вівальдзі “Поры года. Зіма” і Пятра Чайкоўскага “Поры года. Зіма”. Ці падобныя яны?

Такім чынам, знаёмства з творчасцю Паўлюка Труса ў сярэдняй школе адбываецца толькі адзін раз, таму на ўроку мэтазгодна звярнуцца да біяграфічных звестак паэта, а таксама выкарыстаць максімальную колькасць заданняў для актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці вучняў, каб гэтае знаёмства было для іх запамінальным.

## Літаратура


1 Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура” для VI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання [Электронны ресурс]. – Рэжым доступу : https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/belaruskaya-litaratura.html. – Дата доступу : 15.04.2024.

2 Бельскі, А. І. Беларуская літаратура: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / А. І. Бельскі, М. І. Навумчык, Л. К. Цітова. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. – 240 с.



**УДК 373.5.091.3:821.161.3-1*Р.Барадулін**



***Д. Л. Казлова***


# МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ ТВОРЧАСЦІ РЫГОРА БАРАДУЛІНА Ў ВОСЬМЫМ КЛАСЕ


*У артыкуле разглядаецца методыка работы з вершам Рыгора Барадуліна “Трэба дома бываць часцей”, які прапанаваны для вывучэння ў восьмым класе. Аўтар падрабязна паказвае схему працы над лірычным тэкстам, прапаноўвае шэраг заданняў, якія дапамогуць вучням зразумець твор, засвоіць мастацкія тропы. Акрамя гэтага, у артыкуле разглядаюцца метадычныя падыходы да азнаямлення вучняў з паняццем “лірыка” ў межах тэмы “Роды мастацкай літаратуры”.*


Вывучэнне творчасці Рыгора Барадуліна займае значнае месца ў школьным курсе беларускай літаратуры. Дзеці аналізуюць вершы паэта ў шостым і восьмым класах, у адзінаццатым класе асэнсоўваюць яго біяграфію і лірыку манаграфічна. У 8-м класе вывучэнне творчасці Р. Барадуліна адбываецца ў раздзеле “Роды мастацкай літаратуры”. Вучэбная праграма ў межах тэмы ўрока прапануе разгледзець наступныя аспекты: “Рыгор Барадулін. «Трэба дома бываць часцей». Адносіны чалавека да роднага дому, мясцін, дзе праходзіла дзяцінства і юнацтва. Пачуцці і перажыванні, звязаныя з успамінамі пра родных і блізкіх, як выяўленне духоўнасці асобы. Выкарыстанне вобразных магчымасцей мовы (эпітэты, метафары), рытмічных сродкаў. Адметнасць аўтарскай інтанацыі” [1]. На ўроку па вывучэнні гэтага твора, у адпаведнасці з праграмай, трэба пазнаёміцца з паняццямі “роды літаратуры” і “лірыка” як адзін з іх.